# ВЫРАСЦІМ УРАДЖАІ, ДАСТОЙНЫЯ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

На калгасных палях Мінскай вобласці з новай сілай разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва комсамольска-маладзёжных звенняў высокага ўраджаю і комсамольска-маладзёжных трактарных брыгад.

Яшчэ зімой комсамольцы і моладзь дзейна рыхтаваліся да веснавой сяўбы. У вобласці былі створаны 1.158 комсамольска-маладзёжных звенняў высокага ўраджаю з ахватам да дзесяці тысяч комсамольцаў і моладзі, 85 комсамольска-маладзёжных трактарных брыгад з ахватам больш 500 комсамольцаў моладзі.

Правільная арганізацыя працы ў звяне высокага ўраджаю, пачуцці адказнасці за лёс ураджаю далі магчымасць комсамольска-маладзёжным звенням нядрэнна справіцца з веснавой сяўбой. 884 комсамольска-маладзёжныя звяны выканалі давядзены план сяўбы па зернавых да 1 мая і па бульбе да 7 мая.

Райкомы комсамола (Рудзенскі, Пухавіцкі, Мінскі, Дзержынскі, Плешчаніцкі) правільна зразумелі роль і значэнне комсамольска-маладзёжных звенняў. Яны паўсядзённа цікавяцца іх работай, сістэматычна заслухоўваюць на бюро райкома. Работнікі гэтых райкомаў комсамола рэгулярна наведвалі палявыя станы, дзе працавалі звенні, на месцы дапамагалі ліквідаваць недахопы, дабіваліся таго, каб звенні арганізацыйна былі ўмацаваны.

Добра арганізавана работа комсамольска-маладзёжных звенняў высокага ўраджаю ў калгасе «Трэці рашаючы», Пухавіцкага раёна (сакратар комсамольскай арганізацыі Аляксей Лінпік). Тут працуе 9 комсамольска-маладзёжных звенняў высокага ўраджаю. Лепшым з'яўляецца звяно комсамолкі Ольгі Панкратовіч. Звяно да 25 красавіка закончыла сяўбу зернавых культур на плошчы 27 гектараў і пасадку бульбы на плошчы—9 гектараў—да 5 мая. Звяно старанна апрацавала свой участак. На кожны гектар вывезена па 20 тон гною, праведзена падкормка зернавых культур.

У перыяд веснавой сяўбы члены звяна тав. Васілій Гайдуюлак, Нікалай Панкратовіч штодзённа ўзорвалі па 0,80—0,95 гектара пры норме 0,50.

У звяне добра наладжана палітычна-выхаваўчая і культурна-масавая работа. Члены звяна прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці калгаса. Многія з іх з'яўляюцца агітатарамі. Арганізаван выпуск «Баявога лістка». Члены звяна актыўна ўдзельнічаюць у рабоце гурткоў мастацкай самадзейнасці.

У Мінскім раёне ў соцыялістычным спаборніцтве ўдзельнічае 51 комсамольска-маладзёжнае звяно высокага ўраджаю.

У калгасе «Зара» (сакратар комсамольскай арганізацыі тав. Да-

І. ПАЛЯКОЎ,
сакратар мінскага абкома ЛКСМБ.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ